**А. М. Кушнярэвіч, В. В. Навумава**

# НЯМЕЦКІЯ ЎПЛЫВЫ Ў АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ: ФАХВЕРК

У час уваходджання беларускіх земляў у склад Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) іх архітэктура ўзбагачалася новымі будаўнічымі прыёмамі нямецкага дойлідства, у прыватнасці, фахверкам (ням. *Fachwerk, ад Fach – скрыня, секцыя + Werk – пабудова*). У беларускім дойлідстве вядомы пад назвай “прускі мур” (ад польск. mur pruski). Аднак да апошняга часу не даследаваны маштабы яго распаўсюджвання ў айчыннай архітэктуры па прычыне дрэннай яе захаванасці.

Па меркаванні гісторыкаў фахверка, такая тэхніка будаўніцтва была выпрацавана ў нямецкай Саксоніі ў V ст. да н.э. У XI–XII ст. даволі шырока

распаўсюдзіліся ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе. У другой палове XIII ст. з'явілася ў домабудаўніцтве ўсходніх славян. У беларускай архітэктуры далейшае пашырэнне, па меркаванні аўтара, атрымала у першай палове XIV ст., калі ў ВКЛ з'явіліся нямецкія пасяленцы. Таму хутчэй за ўсё найперш у месцах іх кампактнага пражывання і ўзводзіліся фахверкавыя пабудовы.

Самыя ж старажытныя фахверкавыя канструкцыі, што захаваліся да нашага часу ў еўрапейскіх краінах, датуюцца канцом XII-пачаткам XIII ст. У прыватнасці, у гістарычнай забудове Руана, Кведлінбурга, Шмалькальдэна, Эйзенаха, Амбуаза, Кента і іншых нямецкіх, французскіх і брытанскіх гарадоў прыцягваюць увагу незвычайным выглядам цэлыя кварталы фахверкавай архітэктуры, сярэдні ўзрост якой перавышае пяць стагоддзяў. Яе развіццё прайшло праз шэраг мастацкіх стыляў: раманскі, готыка, рэнесанс, барока, класіцызм, мадэрн. У выніку на працягу некалькіх культурных эпох еўрапейскія майстры стварылі высокамастацкі архітэктурны твор – фахверк, які ў'яўляе сабой складаную будаўнічую тэхніку, авалодаць якой можна было толькі шматгадовай практыкай.

Нясучая канструкцыя класічнага фахферка складаецца з сістэмы гарызантальных і вертыкальных драўляных брусоў з запаўненнем прамежкаў паміж імі камнем, цэглай, глінай (саманам) і іншымі матэрыяламі. Звонку па размяшчэнні брусоў можна атрымаць ў'яўленне аб тэктанічнай структуры будынка. У выніку адпала неабходнасць у такіх стандартных элементах класічнай архітэктуры як гзымс, фрыз, пілястры. Таму фахверк у'яўляе сабой тып канструкцыі ў драўляным каркасным будаўніцтве шматлікіх краінаў Цэнтральнай, Паўночнай і часткова Заходняй Еўропы. Фахверкавыя будаўнічыя прыёмы шырока ўжывалася ў іх архітэктуры да XVII ст.

Майстар па ўзвядзенню фахверкавай канструкцыі адначасова быў адмысловым цесляром і мулярам, які цудоўна валодаў тэхналагічнымі нюансамі па злучэнні драўляных брусоў паміж сабой і рознымі тыпамі муроўкі. Ён таксама добра ведаў асновы статыкі, бо яму трэба было ў'яўляць стан фахверкавага каркаса пад час розных канструкцыйных нагрузак. Разам з тым фахверк з'яўляецца творам мастацтва, таму што такая пабудова звычайна была ўпрыгожана дэкаратыўнымі элементамі у тэхніцы разьбы па дрэве, роспісамі, раппартным арнаментам, складзеным з балак, стоек, раскосаў, расстаўленых пэўным чынам. Каларыстыка таксама адыгрывае важную ролю ў фахверкавым дойлідстве.

У раманскі і гатычны перыяды гарадскія дамы Германіі, асабліва у цэнтральнай і заходняй яе частцы, узводзілі ў асноўным у фахверкавых канструкцыях Звычайна іх ставілі тарцамі да вуліцы па прычыне шчыльнай забудовы, таму яны дасягалі па вертыкалі трох-пяці паверхаў. Ніжнія паверхі былі прыстасаваны пад майстэрні ці гандлёвыя памяшканні, верхнія – пад жылыя пакоі. За домам часцей за ўсё размяшчаўся двор з падсобнымі пабудовамі і невялікі сад. Характэрнай рысай дамоў з'яўляўся двухсхільны

дах з трохвугольным франтонам, расчлянёным вокнамі і дэкаратыўнымі нішамі. Вялікіх памераў памяшканні на паддашку выкарыстоўваліся для жыллёвых ці гаспадарчых функцый. З ростам еўрапейскіх гарадоў фахверк выкарыстоўвалі пры ўзвядзенні розных тыпаў грамадзянскіх пабудоў – ратуш, гандлёвых дамоў, таможняў, бальніц, аптэк, гасцініц, складоў, цэйхгаўзаў і інш.

З фахверкам звязаны багаты пласт традыцыйнай культуры немцаў (шматлікія абрады пачатку і завяршэння будаўніцтва фахверкавага жылля, сімволіка арнаментыкі, надпісаў, дэкаратыўнай драўлянай скульптуры). Таму не выпадкова немцы паспяхова выкарыстоўвалі фахверкавую будаўнічую тэхніку пры перасяленні на новыя тэрыторыі, якую яны прынеслі і ў беларускую архітэктуру. Аб гэтым сведчаць вынікі археалагічных даследаванняў беларускіх гарадоў (Вільня, Віцебск, Гародня, Менск), пад час якіх былі выяўлены дэталі каркаснай канструкцыі фахверка. На думку вядомага даследчыка архітэктура Гродна У. І. Кудрашова, “немцы будавалі ўласныя дамы ў Гародні ўжо пры вялікім князі Вітаўце ў канцы XIV-пачатку XVст. і гэты тып жылля мог выкарыстоўвацца да XVI ст. Дамы ж фахверкавага тыпу сустракаюцца ў забудове Гарадніцы, як далей адзначае даследчык, і ў другой палове XVIII ст., што сведчыць аб даволі ўстойлівай традыцыі фахверкага будаўніцтва ў горадзе”, носьбітамі і прадаўжальнікамі якога былі хутчэй за ўсё перасяленцы з германскіх земляў.

У гарадах Беларусі рэшткі рамкава-каркасных пабудоў выяўлены на Верхнім і Ніжнім замках Віцебска, у Гародні, Менску (Л. В. Калядзинскі). Фахверкавая архітэктура, як выявіла Н. Куц, атрымала таксама распаўсюджванне ў Любчы, якая ў 1607 г. разам з замкам перайшла ў валоданьне да прадстаўніка рода Біржанскіх Радзівілаў – Крыштофа Радзівіла, які распачаў тут маштабнае будаўніцтва . Біржанскія Радзівілы мелі трывалыя сувязі зь нямецкім дваром і заходняй Еўропай, таму для ўзвядзення сваіх палацава-замкавых комплексаў часта запрашалі нямецкіх і нідэрляндзкіх майстроў. Дзякуючы іх удзелу культурны ляндшафт Любчы набыў некаторыя рысы, характэрныя для архітэктурнага краявіду Паўночна-Заходняй Еўропы. У выніку ў Любчы паўсталі шэраг пабудоў у характэрнай на той час для нямецкіх, а затым галандзкіх і паўночна-польскіх земляў тэхніцы – «прускі мур», альбо фахвэрк.

На думку аўтараў, фахверкавыя канструкцыйныя прыёмы атрымалі пэўнае распаўсюджванне найперш ў домабудаўніцтве тых беларускіх гарадоў, дзе меліся нямецкія гандлёвыя факторыі і калонніі немцаў-перасяленцаў, якімі і былі ўзведзены першыя ўзоры фахверка ў асобных беларускіх гарадах. У выніку архітэктурнае асяроддзе, аформленае з пункту гледжання ментальных патрэбаў гэтых перасяленцаў, нараджала ў іх адчуванне аўтэнтычнай культурнай прасторы, бо для немцаў фахверк частка нацыянальнай культуры і ідэнтычнасці. Пры гэтым фахверкавае будаўнічае мастацтва не атрымала шырокага распаўсюджвання ў беларускай архітэктуры. Гэта можна растлу-

мачыць не столькі асаблівасцямі клімату, колькі ментальнасцю мясцовых майстоў, бо асваенне больш складанай і прагрэсіўнай тэхнікі фахверкавага будаўніцтва з яе шматлікім сучляненнем драўляных брусоў з цаглянай муроўкай патрабавала надзвычай метадычнага падыходу да працы і шматлікіх гадоў навучання. Таму па прычыне складанай тэхналагіі па ўзвядзенню класічнага фахверка і працяглага тэрміну навучання па яе асваенню перавага была аддадзена ўсходнеславянскім домабудаўніцтвам больш простай у выкананні зрубнай тэхніцы.

Такім чынам, тэхналагічныя і мастацкія асаблівасці фахверка прынеслі ў беларускую архітэктуру мігранты з германскіх земляў. Аднак ён не атрымаў шырокага распаўсюджвання ў традыцыйнай забудове беларускіх гарадоў XIII–XVIII стст. не столькі з-за кліматычных умоў, колькі па прычыне складанага тэхналагічнага працэса па яго ўзвядзенню. Таму ў айчынным дойлідстве фахверкавае будаўнічае мастацтва можна разглядаць як рэдкія праявы эміграцкага настальгічнага стыля пэўнага часу. У выніку фахверкавая архітэктура не стала адным з культурных сімвалаў беларускага горада.